*Ірына Бурдзялёва*

# МІФАЛАГЕМА "ЗАЛАТОГА ВЕКУ" Ў ТВОРЧАСЦІ СЕНТЫМЕНТАЛІСТАЎ

Галоўная задача чалавека ў гэтым свеце – быць шчаслівым. Але будучыня выглядае цьмянай і непрадказальнай, таму людзі ў пошуках ідэалу шчасця звяртаюцца да мінулага. Бясспрэчна, у кожнага чалавека ёсць уласнае разуменне залатой пары свайго жыцця, а ў кожнага народа ёсць кавалак гісторыі, які з адлегласці часу бачыцца найбольш адпаведным ідэалу. Разам з тым, існуе агульнае для многіх народаў уяўленне пра "залаты век" чалавецтва, зафіксаванае ў мностве міфалагічных сістэм і творах мастацтва.

"Залаты век" існаваў у гістарычнай свядомасці не толькі еўрапейцаў. Міф пра ідэальную эпоху чалавечай гісторыі меў месца ў старажытным Вавілоне, Іране, Індыі ды іншых цывілізацыях. "Залаты век" – агульны архетып чалавецтва, настальгічная туга па страчанай гармоніі міжчалавечых узаемаадносін і парушанай еднасці з навакольным светам. Запатрабаванасць міфалагемы "залатога веку" дэманструе імкненне хаця б у марах вярнуцца да гармоніі першавытокаў, да той зыходнай кропкі, ад якой пачаўся няправільны, памылковы шлях людства праз гісторыю.

Найбольш поўна архетып "залатога веку" адлюстраваны ў славутай паэме Гесіёда "Дні і турботы". Разам з тым, у сваім творы аўтар прасочвае паступовую дэградацыю чалавецтва праз век срэбны, а потым медны. Свой час старажытны грэцкі паэт назаве векам жалезным. У ім мы і працягваем жыць.

Залаты світанак Айкумены з захапленнем апісваў у "Метамарфозах" Авідзій. Людзям яшчэ невядома ні беднасць, ні зайздрасць; зямля дае шчодрыя ўраджаі, рэкі цякуць, поўныя малака і нектару, а мёд сачыцца па дрэвах. Няма межаў, прыватнай ўласнасці, войнаў… Адноўленая ў творы гармонія паўстае як салодкі сон чалавецтва пра залатую пару свайго дзяцінства.

У антычнай літаратуры нарадзіўся, а потым стала ўвайшоў у еўрапейскую культуру спецыфічны топас Аркадыі – цудоўнай краіны, увасаблення шчасця і гармоніі "залатога веку".

Старажытны архетып "залатога веку" набыў новае філасофскае насычэнне ў працах Ж.-Ж. Русо і атрымаў незвычайную актуальнасць у літаратуры еўрапейскага сентыменталізму. Прадстаўнікі гэтага мастацкага кірунку крытыкавалі ў сваіх творах не проста канкрэтны гістарычны перыяд або асобныя грамадскія хібы. У ідэйна-эстэтычнай сістэме сентыменталізму ўсебаковай крытыцы і адмаўленню падлягала ўся чалавечая цывілізацыя ўвогуле як памылковая і дэструктыўная, якая знішчыла натуральныя дабрачыннасці і сказіла боскую сутнасць чалавека. "Усё выходзіць чыстым з рук творцы, усё псуецца ў руках чалавека", – асноўны лейтматыў вучэння Ж.-Ж. Русо.

"Залаты век" разам з вобразам шчаслівай Аркадыі становяцца тыповым хранатопам літаратуры сентыменталізму Рэчы Паспалітай. Вядучы паэт-сентыменталіст Ф. Карпінскі ў одзе "Да вольнасці", напісанай адпаведна з русаістычным светапоглядам аўтара, малюе ідэальнае жыццё людзей той бясхмарнай пары на ўлонні прыроды:

Rozkosz ich cała wśród łąki zielonej
Zbiegać się na głos słowika pieszczony,

Swieżo odkryty strumień czystej wody,
I pierwszy owoc, który dał szczep młody.

У тыя часы панавала свабода і справядлівасць, каханне было згодай двух сэрцаў, а паміж людзьмі існавалі шчырыя і адкрытыя адносіны: “Mówili sobie wolno, co myśleli”. Ф. Карпінскі ставіць асаблівы акцэнт на эмацыянальнай лучнасці людзей, падкрэслівае натуральную роўнасць у пачуццях і правах на іх рэалізацыю.

Карпінскі адзначае, што нараджэнне грамадства прывяло да разбурэння першапачатковай гармоніі. Узаконіўшы грошы і прыватную ўласнасць, цывілізацыя пайшла па падманнаму шляху, спарадзіла паразітызм адных і беднасць другіх. У фальшывым і антыгуманным свеце чалавек перастаў нешта значыць як асоба, разбурылася натуральная мараль і натуральныя міжчалавечыя сувязі і стасункі. Такім чынам, міфалагема “залатога веку” ў Ф. Карпінскага выступае як антытэза бязладдзю і абсурду дня сённяшняга.

“Залаты век” для сентыменталістаў звязаны з даграмадскімі стасункамі, з выключна чалавечымі фактарам. У гэтым прынцыповая розніца ў трактоўцы міфалагемы “залатога веку” класіцыстамі і сентыменталістамі. “Залатым векам” класіцызму паўстае ідэальная дзяржава мінулага, найперш эпохі Адраджэння. Для сентыменталістаў “залаты век” сягае далей у гісторыю, калі на зямлі панаваў парадак першатварэння, эмацыянальная і духоўная лучнасць людзей.

Сентыменталізм з’яўляўся абавязковым кампанентам індывідуальнага стылю вядучых прадстаўнікоў літаратуры Беларусі XIX стагоддзя – Я. Чачота, Т. Лады-Заблоцкага, Я. Баршчэўскага, У. Сыракомлі, В. Дуніна-Марцінкевіча – уплываў на іх мастацкае бачанне свету і чалавека, прыўносіў характэрныя гэтаму мастацкаму стылю знакавыя ідэі і вобразы, тэмы і сюжэты. Міфалагема “залатога веку” атрымала ў іх творчасці разнастайную інтэрпрэтацыю.

У кнізе Я. Баршчэўскага “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” з “залатым векам” параўноўваюцца часы Рэчы Паспалітай. Страчаная дзяржава асэнсоўваецца аўтарам найперш з боку маральнай чысціні, некранутых натуральных дабрачыннасцей, у рэчышчы сентыменталізму. Зямны рай нашых продкаў кантрастуе з кепскім і бязладным цяперашнім жыццём. У апавяданні “Жабер-трава” пісьменнік прадказвае яшчэ горшую будучыню і малюе спустошаную, бязлюдную зямлю.

Я. Баршчэўскі падтрымлівае ў творы ідэю Ж.-Ж. Русо аб разбуральнасці прагрэсу і абсурднасці грамадства. Першапрычыну дысгармоніі пісьменнік бачыць у памылках самога чалавека, які парушыў былую дасканаласць, усталяваную Богам і прыродай: “Калі людзі размежылі жалезным ланцугом палі і лясы, калі кожны захацеў стаць багатырам, мець дарагую вопратку і пышныя карэты, – усё змянілася на свеце, багатыя пачалі прыгнятаць бедных, і ўгневаны Бог не блаславіў людскую працу...” [Баршчэўскі 1990, 199–200]. Тэма патрыярхальнага раю, страчанага “залатога веку”, які саступіў месца страшнаму ў сваёй бессардэчнасці “веку жалезнаму”, паўтараецца аўтарам на працягу ўсёй кнігі. “Цяпер жалезны век, лёгка чалавек робіцца горшы”, – ацэньвае рэчаіснасць адзін з герояў [Баршчэўскі 1990, 247].

“Залаты век” ўяўляецца адасобленым ад сучаснага чалавека не толькі часам, але і прасторай. Гамер і Гесіёд у творах прыгадвалі далёкія цудоўныя выспы, на якіх панавала шчасце і вечная гармонія, і куды пасля зямнога жыцця адыходзілі высакародныя героі. Гэтыя выспы знаходзіліся на ўскрайку зямлі, за непраходнымі гарамі або бязмежнымі акіянамі і былі недасягальнымі для звычайных людзей, якія працягвалі сваё гаротнае існаванне сярод хаосу веку жалезнага.

У хрысціянскай культуры архетып "залатога веку", пачатку чалавечай гісторыі, праз замкнёна-цыклічны рух часу, звязваўся з эсхаталагічным канцом –хрысціянскім раем. У біблейскіх тэкстах рай апісаны як сад або як нябесны Іерусалім, але гэтыя вобразы раю ў пэўнай ступені тоесныя. Цікава, што тоеснасць разумення вобразаў сада (гарода) і горада зафіксавана нават ў мове. Словы "гарод" і "горад" эквівалентны як вобразы прасторы, адусюль агароджанай і адасобленай ад знешняга хаосу. Унутраная, замкнёная прастора, усведамляецца як схаваная, спарадкаваная, абжытая і ўтульная.

У беларускіх рэаліях "залаты век" працягвае сваё аўтаномнае існаванне, адмежаваны ад вялікага і дэструктыўнага свету непраходнымі лясамі і азёрамі. Аазісы "залатога веку" Баршчэўскі знаходзіць у старасвецкіх фальварках пачцівай і набожнай шляхты, у патрыярхальнай вёсцы, дзе яшчэ захавалася народная мараль, у самотным жытле, як на выспе рыбака Родзькі.

Міфалагема зямнога раю ўвасоблена ў гасцінным фальварку пана Зямельскага, руплівая праца якога ператварыла колішнюю пустэчу ў "пекны сад". Адным з апошніх прытулкаў "залатога веку", той мілай сэрцу ідылічнай патрыярхальнасці паўстае фальварак самога пана Завальні, з усіх бакоў акружаны вадой і лесам. "Маё жытло – гэта порт на беразе мора", – характарызуе свой дом гаспадар [Баршчэўскі 1990, 177]. У маёнтку пануе дабрачыннасць, сардэчнасць, чалавекалюбства – якасці, рэдкія ў цяперашнім жыцці. Невыпадкова для гэтага ідылічнага куточка час спыніўся. Тут няма нават гадзінніка, які турбаваў бы сваім імклівым бегам і нагадваў пра новыя змены, якія страшаць чулага і сентыментальнага гаспадара.

Нешчаслівы асабісты лёс многіх творцаў нарадзіў асацыяцыі "залатога веку" з вобразамі пакінутай Радзімы. Гэту трактоўку "залатога веку" можна прасачыць у творчасці Я. Баршчэўскага, Т. Лады-Заблоцкага. Беларускі філосаф і літаратуразнаўца У. Конан трапна заўважыў адносна паэмы А. Міцкевіча "Пан Тадэвуш", што гэта "творча-мастацкая сублімацыя, пераўтварэнне тугі па радзіме ў яркія мастацкія карціны сельскага раю…" [Конан 1998, 222–223].

Ян Баршчэўскі ў "Шляхціцы Завальні" з вялікай замілаванасцю апісвае Радзіму-Беларусь, "дзе, здаецца, не скончыўся той залаты век, калі чалавек не разумеў, што такое нядоля і пакуты" [Баршчэўскі 1990, 136]. Ва ўсёй кранальнай прыгажосці паўстае ва ўспамінах цнатлівая прырода дзівоснага краю, "дзе рэчкі з малака і мёду", дзе спакойная, ураўнаважаная плынь жыцця. Перад чытачамі паўстае ідылічны вобраз роднай краіны, куды ўвесь час імкнецца душа, каб суняць боль і тугу па часе, які мінуў беззваротна. Вобразы роднай зямлі – "наймілейшая забава самотным думкам; па іх сумуе, як выгнанніца з раю, заклапочаная душа" [Баршчэўскі 1990, 197].

Мастацкай сублімацыяй настальгічных уяўленняў пра "залаты век" выступае ўлюбёны жанр сентыменталізму – "ідылія" або "сялянка". Пісьменнікі-сентыменталісты ўскладалі на ідылію вялікую выхаваўчую місію і прапаноўвалі мадэль паралельнага развіцця цывілізацыі, якая пабудавана на якасна іншых прынцыпах міжчалавечых узаемаадносін. У трактаце "Пра наіўную і сентыментальную паэзію" Ф. Шылер акрэслівае ідылію як "цудоўную ўзвышаную фікцыю" і тлумачыць яе высакародную выхаваўчую ролю ў гісторыі цывілізацыі: "Чалавеку, які адхіліўся аднойчы ад натуральнай прастаты і аддадзены небяспечнаму кіраўніцтву розуму, бясконца важна зноў сузіраць законы прыроды ў іх чыстым выглядзе і, гледзячы ў гэтае праўдзівае люстэрка, зноў ачысціцца ад праяў ненатуральнасці" [Шиллер 1957, 441].

Ідылічнае светаадчуванне ўласцівае эстэтыцы сентыменталізму, але адначасова з гэтым літаратура сентыменталізму адлюстравала працэс разбурэння ідылічнага стану. У

творах Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, У. Сыракомлі, В. Дуніна-Марцінкевіча гучыць матыў страчанага "залатога веку", разбуранага раю, сцвярджаецца немагчымасць міжчалавечага паяднання ў антыгуманным свеце.

У пачуццёва-сентыментальных успамінах пісьменнікаў дзяцінства і юнацтва таксама параўноўваюцца з залатой парой чалавечага жыцця. Як адзначыў У. Конан, "у сталым веку кожны перажывае сваё асабістае выгнанне з раю". Шматлікія алюзіі дзяцінства з "залатым векам" знаходзім у кнізе Я. Баршчэўскага "Шляхціц Завальня". "Калі малады, зямля – рай, усюды дзівосы", – узгадвае аўтар. "Захопленыя прыгажосцю прыроды, мы знаходзілі ў кожным месцы багоў старажытных рымлян і грэкаў; тут была наша Новая Аркадыя", – апісвае Баршчэўскі чароўную пару дзяцінства [Баршчэўскі 1990, 137]. Праз колькі старонак пісьменнік зноў паўторыць гэты матыў: "Свет у той час здаваўся нам раем, бо ў людзях, што былі побач, мы бачылі толькі зычлівых, шчырых і адданых сяброў" [Баршчэўскі 1990, 142]. Лірычныя згадкі юнацтва прасякнуты сумам і тугой: залаты час адышоў, мары не спраўдзіліся, настаўнікі і старэйшыя сябры спачываюць на могілках.

Тугой па няспраўджаным памкненням прасякнутыя і эмацыянальна-экспрэсіўныя ўспаміны дзяцінства ў гавэндзе У. Сыракомлі "Янка Цвінтарны". З жалем пісьменнік адзначае, што нічога са светлых мараў не здзейснілася ў пазнейшым жыцці, а свет здаецца цяпер зусім інакшым: "Inaczej huczą kościelne dzwony, // Jeden rozbity, drugi zmieniony" [Syrokomla 1872, 75].

Ва ўспамінах дзяцінства Я. Баршчэўскага і У. Сыракомліназіраецца пэўнае супадзенне асацыяцый: знакавым момантам перамен часу і самога сябе выступаюць касцельныя званы, гук якіх нагадвае пра мінулае, але і ён ужо не такі, як калісьці. Гук эфемерны і нараджае асацыяцыі з хуткаплыннасцю часу, чалавечага жыцця і марнасці спадзяванняў. Падобныя асацыяцыі нараджае і напамін пра школьны званочак, што некалі гучаў у манастырскіх сценах. "Залаты век" дзяцінства сплыў, саступіўшы месца жалезнаму веку сталасці.

Падабенства рэфлексій дзяцінства ў Баршчэўскага і Сыракомлі невыпадковая. Дзіцячыя вобразы, увага да дзіцячага светаўспрымання ўласцівы літаратуры еўрапейскага сентыменталізму і звязаны з двухпланавасцю твора, калі свет вачыма маленькага чалавека кантрастуе са светам скажоных каштоўнасцей дарослых. Літаратура імкнулася паказаць жыццё дзіцячай душы ў яе натуральных, пачатковых вартасцях, у якой пануе чысціня і шчырасць. Такі светлы час дзяцінства адноўлены ва ўспамінах Яна Дэмбарога з паэмы У. Сыракомлі "Школьныя часы". Разбурэнне ідыліі ў творы гэта яшчэ і разбурэнне "залатога веку" дзяцінства, развітанне з яго ілюзіямі і марамі.

Сентыменталізм заснаваны на пошуках найперш станоўчага, выяўленні пазітыўных рыс. Калі гармоніі ў наяўнасці не назіралася, як гэта найчасцей і было, то сентыменталізм шукае яе аднаўлення, імкнецца вярнуць страчаны "залаты век". Галоўнае, ён лічыцца цалкам магчымым, да яго можна прыйсці шляхам эвалюцыйнага ўдасканалення чалавека і свету. Паводле поглядаў сентыменталістаў набліжэнне да "залатога веку" можа адбыцца праз зварот да прыроды, вёскі, свету гарманічных пачуццяў. Асаблівая ўвага сентыменталізму надаецца натуральным стасункам, звязаным з першаснымі эмацыянальнымі праявамі чалавека – каханню, сямейным узаемаадносінам.

Нагадаем, што важным сродкам дасягнення міжчалавечай еднасці і паразумення для пісьменнікаў-сентыменталістаў з'яўлялася ўсталяванне "сямейнага" тыпу адносін паміж панамі і сялянамі.

Адным са шляхоў вяртання да "залатога веку" было пачуццё шчырага сардэчнага сяброўства. Паэтызацыя сяброўскіх адносін зрабілася адным з выразных момантаў еўрапейскага сентыменталізму. Дастаткова ўзгадаць такія творы заходнееўрапейскіх і айчынных пісьменнікаў, як "Новая Элаіза" Ж.-Ж. Русо, "Пакуты маладога Вертэра" Гётэ, шматлікія адрасныя вершы Ф. Князьніна, паэзію Я. Ясінскага ("Ліст да сябра", "Да сябра"), Ф. Карпінскага ("Да сябра", "Сяброўская песня пры келіху"). Ф. Карпінскі сумуе па ідэальным сябру, якога ён не можа адшукаць: "Ty jeden umiesz łzy z oczu ocierać".

Ідэі сяброўства і сяброўскай вернасці становяцца надзвычай актуальнымі ў часы нараджэння Таварыства філаматаў і філарэтаў, саюза прамяністых. Само таварыства філаматаў было замацавана асабістым сяброўствам і ствааралася, па словах Ю. Яжоўскага, "не на хвілю, не дзеля мімалётнай забавы, а на ўсё жыццё". У творчасці паэтаў-філаматаў сяброўства з'яўляецца культавай тэмай, якая па актуальнасці і глыбіні асэнсавання стаяла побач з сакральнай тэмай служэння Айчыне.

"Залаты век" сяброўскай Аркадыі паўстае з верша Т. Зана "Шчаслівы, каго цнота…". Я. Чачот надаваў велізарнае значэнне гэтаму пачуццю, ідэалізаваў яго і па-філасофску асэнсоўваў у лістах да А. Міцкевіча, у адрасных вершаваных творах. Паэтызацыя шчырых адносін, высакародных памкненняў, цнатлівага свету маладосці, куды не паспеў яшчэ ўварвацца разбуральны віхор грамадства, увасоблены ў яго вершы "Гэта, бадай, залатыя часы":

> Dzisiaj dla nas wiek złoty
> Błysnął w braterskim gronie,
> Gdze czystym ogniem cnoty
> Serce każdego płonie.
> Słodka przyjaźń i zgoda
> Pokrzepia wiek nasz młody,
> Słodka uczuć swoboda
> I złotych wieków miody [Świrko 1972, 252].

Для Чачота малако ёсць аркадыйскі атрыбут, сімвал часу, калі чалавек меў "Serce słodkie jak z miodu, // Dusza jak mleko biała". Чысцінёй душ і сардэчнай прыязнасцю філаматы ў сваім сяброўскім коле аднавілі гармонію "залатога веку": "Odtąd nam życia rzeki // Miodem i mlekiem cieką".

Ідэі, якія прапануе сентыменталізм дзеля вяртання "залатога веку", цалкам актуальныя і для нашага часу, таму што яны ляжаць у рэчышчы хрысціянскага светаадчування.

**Літаратура**

***Баршчэўскі Я.*** Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Уклад., пер. з пол. мовы і камент. М. Хаўстовіча. – Мн.: Маст. літ., 1990. – 383 с.

***Конан У.М.*** Вобразы і матывы зямнога раю ў паэзіі Адама Міцкевіча // Адам Міцкевіч і нацыянальная культура: Матэрыялы Міжнар. навук. канф. – Мн.: Беларус. кнігазбор, 1998. – С. 220–225.

***Шиллер Ф.*** Собрание сочинений: В 7 т. – М.: Гослитиздат, 1957. – Т. 6. – 791 с.

***Syrokomla W.*** Poezye: Wyd. zupełne. W 10 t. – Warszawa, 1872. – Т. 3. – 359 s.

***Świrko S.*** Z kręgu filomackiego preromantyzmu. – Warszawa, 1972. – 390 s.